**Віталь Крывуць**
(Баранавічы)

# Праўрадавыя моладзевыя арганізацыі і іх дзейнасць у сферы дзяржаўнага выхавання на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд

Правячы рэжым санацыі, які ўсталяваўся пасля мая 1926 г., шмат рабіў, каб перацягнуць на свой бок малодое пакаленне краіны. Справа ў тым, што грамадства II Рэчы Паспалітай было даволі маладым. Як сведчаць даследаванні тагачасных дэмографаў, насельніцтва ва ўзросце да 25 гадоў у адносінах да ўсіх жыхароў міжваеннай польскай дзяржавы вагалася ў межах ад 57% (1921 г.), 53,5% (1931) і да 50,2% (1936)[1].

Менавіта з мэтай уплыву на такую значную групу насельніцтва правячыя колы распрацавалі і пачалі актыўна рэалізоўваць так званую канцэпцыю «дзяржаўнага выхавання». Мерапрыемствы па яе рэалізацыі ахоплівалі, у тым ліку, заходнебеларускую моладзь.

Канцэпцыя базавалася на трох асноўных прынцыпах:

1. стварэнне пазітыўнага ўзору грамадзяніна-дзяржаўніка;
2. прызнанне таго, што дзяржава мае права навязваць грамадзянам сваю ўласную выхаваўчую канцэпцыю;
3. толькі дзяржаўная ўлада, абвяшчаючы прымат сваіх інтарэсаў, мае права на выхаваўчую дзейнасць, і толькі дзяржава з'яўляецца адзінай сілаю, здольнай выразіць і гарантаваць вяршэнства ўсеагульных інтарэсаў над інтарэсамі партыкулярнымі і індывідуальнымі, партыі ж не маюць ніякага права ўплываць на выхаванне і рэалізацыю выхаваўчага ідэалу[2].

Ацэньваючы санацыйную выхаваўчую канцэпцыю, неабходна сказаць, што гэта была даволі стройная і дэтальна распрацаваная сістэма. Яе станоўчымі рысамі былі сувязь з жыццём і практычная накіраванасць, выхаваўчы характар навучання ў школе. Яна ставіла перад сабой мэту выхаваць у моладзі моцную волю, дынамізм, дысцыплінаванасць, здольнасць да ахвярнасці і гераізму. Але ўсе гэтыя пазітыўныя рысы дзяржаўнага выхавання былі падпарадкаваны прагматычным мэтам кіруючых колаў II РП, якія імкнуліся перацягнуць на свой бок маладое пакаленне дзяржавы. Санацыя, якая атасаямляла сябе з дзяржа-

[1] *Młodzież sięga po pracę. Załącznik, tablice*, Warszawa 1938, s. 11.
[2] W. Kulesza, *Koncepcje ideowo-polityczne obozu rządzącego w Polsce w latach 1926-1935*, Wrocław 1985, s. 211-212.

вай, фактычна навязвала грамадству свае выхаваўчыя ідэалы. Яшчэ адным адмоўным бокам дадзенай канцэпцыі было тое, што ў выніку сваёй эвалюцыі, асабліва з сярэдзіны 1930-х гг., яна фактычна пераняла метады і ідэі эндэцкага нацыянальнага выхавання. У выніку гэтыя дзве канцэпцыі, як адзначаюць некаторыя даследчыкі, адрозніваліся не зместам, а паняційным апаратам, тэрміналогіяй і традыцыямі[3]. Абедзве яны з'яўляліся сродкам паланізацыі нацыянальных меншасцей. Фактычна ставілася мэта выхаваць не проста добрага грамадзяніна, а грамадзяніна-паляка. Гэта і прыводзіла да неэфектыўнасці дзяржаўнага выхавання на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў адрозненне ад непасрэдна польскіх зямель, дзе яно дасягнула значных пазітыўных вынікаў.

Асноўнай тэрыторыяй, дзе павінна была адбывацца рэалізацыя канцэпцыі дзяржаўнага выхавання, была школа. Але, трэба адзначыць, што асноўная частка моладзі II РП, асабліва на тэрыторыі Заходняй Беларусі, мела магчымасць вучыцца толькі ў пачатковых класах усеагульнай школы. Пасля гэтага яна як бы выходзіла з-пад выхаваўчых уплываў санацыйнай сістэмы адукацыі. Зразумела, што правячыя колы міжваеннай польскай дзяржавы не маглі мірыцца з такой сітуацыяй. Таму важная роля ў ажыццяўленні канцэпцыі дзяржаўнага выхавання адводзілася шматлікім праўрадавым моладзевым арганізацыям, якія дзейнічалі ў мэтах інтэграцыі шырокіх мас моладзі ў працу для дзяржавы. Кожная з гэтых арганізацый мела свае спецыфічныя мэты і канкрэтныя задачы, арганізацыйныя прынцыпы і метады працы. Але ўсе яны карысталіся сур'ёзнай падтрымкай санацыйнага рэжыму. Менавіта структуры правячага Беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам, а з 1936 г. — Лагера нацыянальнага аб'яднання займаліся распрацоўкай агульнай праграмы ідэйна-выхаваўчай працы і каардынацыяй дзейнасці шматлікіх праўрадавых арганізацый і саюзаў. Вынікам гэтай дзейнасці санацыі стала стварэнне ў лютым 1938 г. пры Лагеры нацыянальнага аб'яднання Службы маладых, якая павінна была стаць кіруючай інстанцыяй праўрадавага моладзевага руху[4].

Патранаж улад не толькі вызначаў галоўныя накірункі дзейнасці праўрадавых арганізацый, якія фармальна з'яўляліся самастойнымі, апалітычнымі і мелі сваё ўласнае кіраўніцтва, але і забяспечваў ім сур'ёзную матэрыяльна-фінансавую і метадалагічную падтрымку, колькасны рост і клімат найбольшага спрыяння ў грамадска-палітычным жыцці краіны.

[3] K. Jakubiak, *Idea wychowania obywatelskiego w polskiej myśli pedagogicznej przełomu XIX i XX wieku oraz okresu Drugiej Rzeczypospolitej*, [w:] *Wychowanie a polityka. Między wychowaniem narodowym a państwowym*, Toruń 1999, s. 91-99.

[4] B. Hillebrandt, *Polskie organizacje młodzieżowe XIX i XX wieku: zarys historii*, Warszawa 1986, s. 271.

Адной з найбольш масавых моладзевыхх арганізацый II РП з'яўляўся Стралецкі саюз «Стралец». Традыцыі гэтай арганізацыі бралі свой пачатак яшчэ ў даваенным перыядзе. У 1908 г. улады Аўстра-Венгерскай імперыі далі дазвол на стварэнне польскіх ваенізаваных арганізацый. Адной з іх, Саюзам стралкоў, кіраваў Юзэф Пілсудскі. З пачаткам Першай сусветнай вайны ваенізаваныя саюзы сталі асновай створаных па ініцыятыве Ю. Пілсудскага Польскіх легіёнаў, якія адыгралі важную ролю ў адраджэнні незалежнасці польскай дзяржаўнасці[5].

У 1919 г. «Стралец» аднавіў сваю дзейнасць, у тым ліку і ў выхаваўчай сферы. У статуце арганізацыі адзначалася, што яго мэтай з'яўляецца «абуджэнне і выхаванне ў сваіх членаў нацыянальнага духу, дысцыпліны, маральнай і фізічнай стойкасці, а таксама распаўсюджванне ваенных ведаў»[6]. Для рэалізацыі гэтай мэты вялася мэтанакіраваная праца па ваеннай падрыхтоўцы, грамадзянскім і фізічным выхаванню «грамадзяніна-салдата для дабра Рэчы Паспалітай»[7]. У Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне «Стралец», акрамя таго, вёў значную працу ў духу «выхавання на крэсах свядомасці спайкі з усёй дзяржавай»[8]. У адным з артыкулаў у друкаваным органе «Стральца» адзначалася, што на «Крэсах усходніх мы жадаем стаць распаўсюджвальнікамі польскай культуры, будзіць сімпатыі і давер да адзінай Польшчы»[9]. Такім чынам, арганізацыя, акрамя ўсяго іншага, была адным з асяродкаў паланізацыі заходнебеларускай моладзі.

Згодна са статутам арганізацыі, яе членамі маглі быць як юнакі, так і дзяўчаты. Існавала ўнутранае дзяленне на выхаваўча-ўзроставыя групы: арляняты стралецкія (з 13 да 17 год), юнакі стралецкія (з 17 да 19 год) і стральцы (пасля 19 год), якія ў сваю чаргу дзяліліся на дапрызыўнікоў і рэзервістаў[10]. Крыніцы сведчаць, што ў асноўным Стралецкі саюз аб'ядноўваў дапрызыўную моладзь ва ўзросце ад 18 да 21 года[11].

Афіцыйна «Стралец» называўся грамадскай арганізацыяй. Грамадскі характар арганізацыі надавалі ажыццяўленне грамадзянскага выхавання, прынцып добраахвотнасці ўступлення, частковая выбарнасць кіраўніцтва і яго адказнасць перад радавымі членамі Стралецкага саю-

[5] *Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і Народа*, Варшава 2006, с. 166-167.

[6] *Słownik organizacji młodzieżowych w Polsce 1918-1970*, Warszawa 1971, s. 174.

[7] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей: НАРБ), фонд 242п, вопіс 1, справа 465, аркуш 105.

[8] *Политические партии в Польше, Западной Белоруссии и Западной Украине*, Минск 1935, с. 178.

[9] Ю. Грыбоўскі, *Беларусы ў польскіх рэгулярных вайсковых фарміраваннях 1918-1945 гадоў*, Санкт-Пецярбург 2006, с. 132.

[10] *Program dla grup wiekowo-wyszkoleniowych w oddziałach i pododdziałach Związku Strzeleckiego w zakresie wychowania obywatelskiego*, Brześć nad Bugiem 1937, s. 8.

[11] *Słownik organizacji młodzieżowych w Polsce...*, s. 174.

за, прынцып самафінансавання — «даваць, а не браць у дзяржавы». Ваенны характар выяўляўся ў рэалізацыі праграмы ваеннай падрыхтоўкі. Дваістасць назіралася і ў сістэме кіравання. Кіраўніцтва складалася з двух элементаў: грамадскага, якое абіралася, было неаплачваным і называлася Праўленнем, і ваеннага, якое прызначалася, аплачвалася і называлася Камендатурай[12].

Тэрытарыяльная структура «Стральца» супадала з дыслакацыяй ваенных акруг Войска Польскага. У Заходняй Беларусі існавалі дзве акругі Стралецкага саюза — № 3 «Гродна» і № 9 «Палеская». Яны адпавядалі 3-й і 9-й акругам польскай арміі са штабамі ў Гродне і Брэсце. Акруга «Гродна» падзялялася на падакругі з цэнтрамі ў Беластоку, Вільні, Гродне і Маладзечне. «Палеская» акруга мела падакругі Навагрудак і Брэст. Падакругі дзяліліся на паветы і гміны. У паветах ствараліся павятовыя камендатуры Саюза. На чале іх стаялі спецыяльна прызначаныя афіцэры. У гмінах «Стралец» узначальвалі гмінныя каменданты. Звычайна гэтыя пасады займалі таксама афіцэры. У выключных выпадках камендантамі з'яўляліся чыноўнікі, якія прайшлі вайсковую службу і мелі званне не ніжэй унтэр-афіцэра. Акруга была разлічана на корпус «Стральца», падакруга — на дывізію ці батальён, павет — на батальён ці полк, гміна — на роту. Арганізацыйнай адзінкай быў атрад, які ахопліваў моладзь адной ці некалькіх вёсак[13].

Асноўнымі крыніцамі для развіцця дзейнасці «Стральца» былі датацыі ад Галоўнай камендатуры Саюза, членскія ўзносы, ахвяраванні і дапамога з боку мясцовага самакіравання. Неабходна адзначыць, што загад ваеннага міністэрства напрамую абавязваў дзяржаўны апарат аказваць апеку арганізацыям, якія праводзяць ваенную падрыхтоўку. Канчаткова дадзеная практыка была замацавана ў 1933 г., калі быў прыняты дэкрэт аб адзяржаўленні «Стральца», які фактычна ўзаконіў утрыманне стралецкіх арганізацый за кошт мясцовага кіравання. З гэтага моманту «Стралец» выступаў не толькі як грамадская арганізацыя, але і як «дзяржаўная пляцоўка» ваеннай падрыхтоўкі. Менавіта гэта давала членам саюза заканадаўча замацаваныя ільготы.

Яшчэ адной масавай і актыўнай праўрадавай моладзевай арганізацыяй II Рэчы Паспалітай з'яўляўся Саюз вясковай моладзі «Сеў» (СВМ «Сеў»), які з 1934 г. называўся Саюзам маладой вёскі (СМВ). Як сведчаць архіўныя крыніцы і літаратура, найбольшую актыўнасць ён праяўляў менавіта на тэрыторыі Віленскага і Палескага ваяводстваў[14].

СВМ «Сеў» узнік у 1928 г. пасля расколу ў агульнапольскім Цэнт-

[12] A. Pruszkowski, *Przewodnik społeczny*, Warszawa 1934, s. 83.
[13] НАРБ, ф. 242п, воп. 1, спр. 465, арк. 106-107.
[14] *Słownik organizacji młodzieżowych w Polsce...*, s. 19.

ральным саюзе вясковай моладзі, які адбыўся на глебе адносін да кіруючага санацыйнага лагера. Апазіцыйныя санацыі элементы, якія арыентаваліся на сялянскую партыю Стронніцтво Людовэ, стварылі Саюз вясковай моладзі Рэчы Паспалітай «Віці», а прыхільнікі санацыі ўвайшлі ў склад СВМ «Сеў» (абедзве арганізацыі атрымалі назвы ад назваў сваіх цэнтральных друкаваных выданняў)[15].

Да 1931 г. СВМ «Сеў» знаходзіўся ў арганізацыйным і ідэалагічным падпарадкаванні Цэнтральнага саюза сельскагаспадарчых гурткоў — гаспадарчай арганізацыі, якая мела перад сабой мэту павышэння прадукцыйнасці земляробства і абарону інтарэсаў сельскай гаспадаркі шляхам распаўсюджвання сельскагаспадарчых ведаў, арганізацыі сялян у прафесійныя саюзы і саюзы ўзаемадапамогі. Гэтая арганізацыя ўзнікла ў межах дзяржаўнага плана па ўніфікацыі земляробчых арганізацый. Яна аб'ядноўвала не толькі сялян, але і буйных землеўладальнікаў і асаднікаў і з'яўлялася апорай санацыі на вёсцы[16].

Пасля 1931 г. СВМ «Сеў» стаў самастойнай арганізацыяй. Яго дзейнасць абапіралася на ўласны статут, што ў значнай меры садзейнічала ўмацаванню яго аўтарытэту і спрашчала доступ да моладзі. Да 1934 г. яго дзейнасць распаўсюдзілася на тэрыторыі Віленскага і Палескага ваяводстваў.

Трэба адзначыць, што на тэрыторыі Навагрудскага ваяводства да 1934 г. дзейнічаў аўтаномны Саюз вясковай моладзі Навагрудскай зямлі. Ён таксама аформіўся пасля расколу Цэнтральнага саюза вясковай моладзі. Калі ў 1930 г. перад гурткамі вясковай моладзі Навагрудскага ваяводства паўстала пытанне аб далучэнні да «Віці» ці «Севу», быў праведзены спецыяльны з'езд. На ім аднагалосна было вырашана «захаваць для дабра маладой украіннай вёскі і для дабра дзяржаўнай справы поўную самастойнасць і незалежнасць ад цэнтраляў у Варшаве, каб абараніць нашу тэрыторыю ад непажаданай і шкоднай арганізацыйнай барацьбы ў нездаровай атмасферы». «Віці» і «Сеў» вымушаны былі згадзіцца з такім рашэннем[17]. Але дадзеная аўтаномія была аднаснай. Так, СВМ Навагрудскай зямлі адпраўляў сваіх дэлегатаў на ўсе з'езды, канферэнцыі і курсы, якія арганізоўваў СВМ «Сеў». Акрамя таго, ён выкарыстоўваў і яго выдавецкія магчымасці, змяшчаючы на старонках «Севу» свае камунікаты (справаздачы)[18].

У пачатку 30-х гадоў на Навагрудчыне спрабаваў замацавацца і скласці канкурэнцыю СВМ Навагрудскай зямлі Саюз народнай моладзі

[15] J. Wypych, *Przed «Wiciami». Ruch młodzieży wiejskiej do 1928 roku*, [w:] *Przed «Wiciami» i po «Wiciach». Zarys dziejów ruchu młodowiejskiego*, Warszawa 1986, s. 68-69.
[16] A. Pruszkowski, *Przewodnik społeczny*, s. 175.
[17] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (далей: ДАБВ), ф. 1, воп. 9, спр. 9, арк. 4.
[18] A. Pruszkowski, *Przewodnik społeczny*, s. 65.

(СНМ), дзейнасць якога ахоплівала ў асноўным польскія рэгіёны II Рэчы Паспалітай. Гэта выклікала канфлікт дадзенай арганізацыі з Навагрудскім саюзам. Ён запатрабаваў ад СНМ адмовіцца ад працы на тэрыторыі ваяводства, ліквідаваць свае гурткі ці перадаць іх у яго распараджэнне[19]. Тым не менш, гурткі СНМ працягвалі дзейнічаць у Стаўбцоўскім, Баранавіцкім і Навагрудскім паветах. Дарэчы, падобная «барацьба за душы» разгарнулася паміж СНМ і «Стральцом» на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства[20].

Канкурэнцыя, якая склалася сярод гэтых арганізацый, значна аслабляла пазіцыі санацыі ў асяроддзі вясковай моладзі і перашкаджала ажыццяўленню яе планаў. Таму санацыйныя колы правялі шэраг мерапрыемстваў па аб'яднанню сваіх прыхільнікаў. Адным з гэтых мерапрыемстваў стала арганізацыйная кансалідацыя шматлікіх саюзаў вясковай моладзі. 4 верасня 1934 г. СВМ «Сеў» аб'яднаўся з шэрагам рэгіянальных арганізацый — Малапольскім СВМ, СВМ Навагрудскай зямлі, СНМ і інш. Новая арганізацыя стала называцца Саюзам маладой вёскі. Вядучую ролю ў кіраўніцтве новага Саюза адыгрывалі былыя функцыянеры СВМ «Сеў»[21].

Афіцыйна Саюз лічыўся культурна-асветнай арганізацыяй, якая ставіла перад сабой мэту «павышэнне духоўнага і гаспадарчага ўзроўню і грамадзянскага пачуцця сваіх членаў, узбагачэнне культуры вёскі і Рэчы Паспалітай»[22]. Згодна са статутам, дасягненне пастаўленых мэт Саюза адбывалася на аснове прыцягнення членаў да розных відаў грамадскай дзейнасці: арганізацыі і правядзення чытанняў, дыскусій, вечарын, тэатральных пастановак, сельскагаспадарчых курсаў і конкурсаў, будаўніцтва святліц (клубаў), стварэння кас узаемадапамогі. У статуце спецыяльна агаворвалася, што партыйна-палітычныя справы не ўваходзяць у сферу дзейнасці Саюза[23].

СВМ «Сеў» — СМВ стаяў на пазіцыях санацыйнай канцэпцыі дзяржаўнага выхавання, абраўшы сваім лозунгам словы «Дабро дзяржавы — вышэйшы закон»[24]. Саюз імкнуўся да перабудовы вёскі эвалюцыйным і прагрэсіўным шляхам. Заяўлялася, што «Сеў» «стаіць на пазіцыі грамадскай і палітычнай дэмакратыі, якая разумелася як павышэнне культурнага ўзроўню мас і далучэнне ўсяго народа да працы для дзяр-

[19] ДАБВ, ф. 1, воп. 9, спр. 9, арк. 4.
[20] ДАБВ, ф. 1, воп. 9, спр. 9, арк. 1-3.
[21] *Słownik organizacji młodzieżowych w Polsce...*, s. 19.
[22] *Budowa organizacyjna Poleskiego Wojewódzkiego Związku Młodzieży Wiejskiej*, Brześć nad Bugiem 1930, s. 3.
[23] Tamże, s. 4.
[24] A. Kołodziejczyk, *Ruch ludowy a Kościół rzymskokatolicki w latach II Rzeczypospolitej*, Warszawa 2002, s. 463.

жавы (...) лічыць, што адзінай легітымацыяй чалавека з'яўляецца праца і яго ўклад у працу па будаўніцтве Польскай Дзяржавы». У якасці выхаваўчага ідэалу быў абраны баец-работнік, узорам якога была асоба Ю. Пілсудскага[25]. Ставілася задача: «выхоўваючы душу маладога вясковага чалавека згодна з ідэйнымі прынцыпамі Правадыра Народа Маршала Юзэфа Пілсудскага, стварыць Дасканалага Грамадзяніна, які ўсведамляе свае правы і абавязкі»[26].

Арганізацыйная дзейнасць Саюза будавалася на аснове разгалінаванай, строга цэнтралізаванай структуры з цэнтрам у Варшаве. Яму падпарадкоўваліся ваяводскія Саюзы: на тэрыторыі Заходняй Беларусі — Віленскі, Палескі і (пасля 1934 г.) Навагрудскі. Ваяводскім саюзам, у сваю чаргу, падпарадкоўваліся акруговыя саюзы ў паветах, якія аб'ядноўвалі пярвічныя ячэйкі — гурткі вясковай моладзі.

У адрозненні ад «Стральца» сістэма кіруючых органаў СВМ «Сеў» — СМВ была больш дэмакратычнай. Вышэйшай уладай лічыўся штогадовы Агульны з'езд, які тайным галасаваннем абіраў Праўленне Саюза. З Праўлення фарміраваўся Прэзідыум. На месцах ваяводскія з'езды, акруговыя сходы і сходы гурткоў адпаведным чынам фарміравалі мясцовыя кіраўнічыя органы. Прадугледжвалася не толькі падпарадкаванне ніжэйстаячых органаў вышэйстаячым, але і падначаленасць кіраўніцтва і яго штогадовая ратацыя[27].

Членамі Саюза маглі быць паўналетнія грамадзяне II РП, але пры гэтым дазвалялася членства і з 16 год у якасці «элеваў» (вучняў, выхаванцаў). Кожны член арганізацыі павінен быў дзейнічаць «згодна з патрабаваннямі хрысціянскай этыкі і ўласнай годнасці грамадзяніна Рэчы Паспалітай», прытрымлівацца статута Саюза і рашэнняў яго вышэйстаячых органаў, рэгулярна наведваць сходы і аплачваць членскія ўзносы[28].

Стралецкі саюз і СВМ «Сеў» — СМВ ахоплівалі ў асноўным вясковую моладзь. Для працы сярод гарадской работніцкай і рамесніцкай моладзі ў 1933 г. была створана Арганізацыя працуючай моладзі (АПМ), у склад якой увайшоў шэраг рэгіянальных арганізацый. Адной з самых буйных такіх арганізацый было Аб'яднанне рамеснай і прамысловай моладзі Віленскага ваяводства, якое ў 1933 г. налічвала толькі ў адной Вільні каля 900 чалавек[29]. АПМ лічылася, як і іншыя санацыйныя групоўкі, арганізацыяй, якая стаяла па-за палітыкай. Галоўнай яе задачай абвяшчалася распаўсюджванне апекі над моладдзю ў форме супраць-

[25] A. Pruszkowski, *Przewodnik społeczny*, s. 62.
[26] *Sprawozdanie Poleskiego Wojewódzkiego Związku Młodzieży Wiejskiej za rok 1931-1932*, Brześć nad Bugiem 1933, s. 1.
[27] *Budowa organizacyjna Poleskiego Wojewódzkiego Związku Młodzieży Wiejskiej*, s. 6.
[28] Tamże, s. 16.
[29] НАРБ, ф. 242п, воп. 1, спр. 465, арк. 243.

дзеяння антыдзяржаўным уплывам праз выхаванне ў грамадска-дзяржаўніцкім духу. Вялікая ўвага надавалася дапамозе ў працаўладкаванні маладым беспрацоўным[30].

Згодна з «Інструкцыяй Галоўнага ўпраўлення АПМ аб працы гурткоў працоўнай моладзі», асноўнай арганізацыйнай ячэйкай АПМ з'яўляўся «ачаг», які ахопліваў тэрыторыю раёна вялікага горада. На чале «ачага» стаяў кіраўнік. АПМ дзейнічала выключна ў гарадах і мела строгую іерархічную структуру. Выкананне кіруючых функцый залежыла не ад «выпадковых вынікаў выбараў», а ад праходжання арганізацыйнай школы. Прэтэндэнт на кіруючую пасаду павінен быў атрымаць ступень толькі пасля адпаведнага навучання і экзаменаў[31].

Моладзь унутры ячэйкі дзялілася на калектывы (ад 6 да 15 чалавек). Менавіта ў гэтых калектывах вялася праца, якая мела сваёй мэтай «самавыхаванне і фармаванне характару». Калектыў узначальваў перадавік, які прызначаўся кіраўніком «ачага».

Адначасова ў «ачагу» АПМ фармаваліся «рэалізацыйныя гурткі» (музычныя, тэатральныя, спартыўныя, рамесніцкія, харавыя і г. д.), у якіх моладзь уваходзіла незалежна ад прыналежнасці да асобных калектываў. На чале гурткоў стаялі адпаведныя інструктары, якія таксама прызначаліся кіраўніком «ачага». Такім чынам, грамадска-выхаваўчая праца праводзілася ў калектывах, а адпачынак і навучанне — у гуртках.

Члены АПМ дзяліліся на кандыдатаў, удзельнікаў і рэчаісных членаў. Кандыдаты (ва ўзросце 14-21 гг.) прымаліся ў АПМ кіраўніком «ачага».

Інструкцыя прызнавала наступныя сродкі выхаваўчай працы:

1. клубная праца (інфармацыя, тэхнічнае забеспячэнне, бібліятэка, чытанне прэсы, клубныя вечарыны, спевы, відовішчы, краязнаўчыя экскурсіі, гутаркі, самаадукацыя);
2. фізічнае выхаванне;
3. уладкаванне «ачага» і арганізацыя ў ім майстэрняў;
4. самадапамога, прадстаўленне магчымасці атрымаць аплачваемую працу (стварэнне бюро пасрэдніцтва працы), аказанне матэрыяльнай дапамогі бедным, прапаганда ашчаднасці і стварэнне кас узаемадапамогі[32].

Менавіта апошні момант — дапамога ў працаўладкаванні і матэрыяльная падтрымка — забяспечвалі АПМ колькасны рост і ўплыў ва ўмовах эканамічнага крызісу. Але па меры эканамічнай стабілізацыі і выхаду краіны з крызісу ўплыў АПМ зменшыўся, а колькасць яе членаў скарацілася.

[30] A. Pruszkowski, *Przewodnik społeczny*, s. 98.
[31] B. Hillebrandt, *Polskie organizacje młodzieżowe...*, Warszawa 1986, s. 89.
[32] ДАБВ, ф. 67сч, воп. 2, спр. 1668, арк. 1-5.

Стварэнне і падтрымка санацыйных моладзевых аб'яднанняў стала неад'емнай часткай выхаваўчай палітыкі правячых колаў II РП на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Мясцовыя ваяводскія і павятовыя ўлады праяўлялі значную актыўнасць у гэтым накірунку.

Напрыклад, у лютым 1930 г. палескі ваявода Ян Крахельскі накіраваў усім павятовым старастам спецыяльны ліст, які быў прысвечаны пытанню стварэння ячэек Палескага СВМ. У ім адзначалася, што ў шэрагу задач, якія стаяць перад дзяржаўнай адміністрацыяй, асабліва на ўсходніх ускраінах, найважнейшай з'яўляецца кантроль над тым, каб развіццё грамадскага жыцця вёскі адбывалася «па лініі развіцця польскага дзяржаўнага шляху». Ваявода падкрэсліваў, што «цяперашні ўрад звяртае значную ўвагу на тое, каб, перш за ўсё, падрастаючае пакаленне атрымала такія ўмовы развіцця, якія б давалі гарантыю выхавання з цяперашняй моладзі грамадзян, на якіх Дзяржава магла б абаперціся. Таму пан міністр унутраных спраў робіць націск на больш паспяховае развіццё арганізацый сельскай моладзі»[33].

Ваявода, растлумачыўшы сутнасць і задачы СВМ, адзначаў, што праца Саюза на месцах будзе праводзіцца ў цеснай згодзе з павятовымі старастамі: «Урад маральна і матэрыяльна падтрымлівае дзейнасць СВМ і чакае таго ж ад тэрытарыяльнага самакіравання, паколькі лічыць працу СВМ адной з найважнейшых задач цяперашняга перыяду»[34].

Старастам даручалася асабіста цікавіцца працай Саюза, аказваць матэрыяльную дапамогу «нават за кошт іншых пазіцый у справах асветы, падтрымкі культуры ці земляробчай асветы». Акрамя таго, старасты павінны былі падтрымліваць сталы кантакт з ваяводам і кіраўніком ваяводскага СВМ, неадкладна паведамляць аб усіх адмоўных з'явах у развіцці арганізацыі ці дзейнасці асобных яе прадстаўнікоў. У заключэнне ваявода заяўляў: «Асабіста я лічу развіццё працы СВМ адным з важнейшых фактараў у выкананні тых задач, якія ўскладаюцца на нас як прадстаўнікоў урада і адказных кіраўнікоў палітычнай адміністрацыі, і чакаю поўнага разумення важнасці апекі і супрацоўніцтва ў развіцці гэтых прац»[35].

Апека дзяржаўнай адміністрацыі і дзеячаў санацыі выяўлялася ў першую чаргу ў непасрэдным удзеле ў арганізацыі праўрадавых моладзевых саюзаў. Напрыклад, у Вільні ганаровыя пасады ў «Стральцы» займалі такія лідары санацыі, як Ян Пілсудскі (брат Ю. Пілсудскага), былы віленскі ваявода Стэфан Кіртыкліс, былы маршал Сената прафесар Юльян Шыманскі[36]. Такім жа чынам складвалася сітуацыя і на павято-

[33] ДАБВ, ф. 1, воп. 9, спр. 483, арк. 17.
[34] Там жа.
[35] ДАБВ, ф. 1, воп. 9, спр. 483, арк. 18.
[36] НАРБ, ф. 242п, воп. 1, спр. 465, арк. 107.

вым узроўні, дзе стралецкія атрады ўзначальвалі паліцэйскія і мясцовыя чыноўнікі[37]. Згодна справаздачам павятовых чыноўнікаў, ужо ў 1930 г. абсалютная большасць кіраўнікоў ячэек СВМ на Палессі былі членамі ці прыхільнікамі Беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам[38].

Праўда, такая актыўнасць чыноўніцтва мела і адваротны бок. Архіўныя дакументы сведчаць, што ў польскіх улад проста не хапала чыноўнікаў, каб заняць усе кіруючыя пасады ў грамадскіх арганізацыях. Так, у 1930 г. павятовы камендант Стралецкага саюза паведамляў з Драгічына пра такі недахоп кіруючых кадраў: «Вялікая цяжкасць складаецца ў тым, што акрамя выканання прафесійных абавязкаў амаль кожны чыноўнік з'яўляецца адначасова членам праўлення якога-небудзь грамадскага таварыства ці секцыі, таму часта яны ходзяць з аднаго сходу на другі; а іншых абраць немагчыма, паколькі іх няма»[39]. Фактычна такое становішча магло ператварыць дзейнасць таго ж «Стральца» ў фармальнасць.

Вялікую ролю ў развіцці праўрадавага моладзевага руху адыгрывалі асаднікі і памешчыкі. Так, у 1935 г. у маёнтках Нягневіцкага раёна памешчыкі стварылі са сваіх батракоў атрады конных стральцоў (кракусаў), іх навучанне ажыццяўляў мясцовы асаднік[40]. Аднак у большасці выпадкаў інструктарамі ваеннай падрыхтоўкі былі афіцэры вайсковых частак, паліцыі ці Корпуса аховы памежжа (КАП).

Неабходна адзначыць вялікую ролю ў арганізацыйным і колькасным умацаванні праўрадавых арганізацый настаўнікаў польскіх школ. Так, у лютым 1932 г. Лідскі акруговы камітэт Камуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі паведамляў: «У апошні час узмацнілася агітацыя фашысцкіх арганізацый праз Сакратарыяты Беспартыйнага Блоку, Кулкі Рольнічэ, ЗМВ. У адной Лідскай акрузе настаўнікамі і працаўнікамі сакратарыятаў ББ было праведзена 700 дакладаў і 400 сходаў. Іншы раз даклады праводзяцца на беларускай мове»[41]. У справаздачы Палескага ваяводскага СВМ падкрэслівалася, што «адносіны з настаўніцтвам заслугоўваюць пахвалы. Настаўніцтва стаіць каля ўсіх працоўных месцаў Саюза. Яно прымае ўдзел у працы Гурткоў, Акруговых Саюзаў, Ваяводскага Праўлення, праводзіць гутаркі і курсы, рэжысіруе тэатральныя пастаноўкі, дае парады, апякае, сочыць, заахвочвае»[42]. Цікавую статыстыку адносна ўдзелу настаўніцтва ў грамадскай працы

[37] НАРБ, ф. 242п, воп. 1, спр. 483, арк. 63.
[38] ДАБВ, ф. 1, воп. 9, спр. 714, арк. 18.
[39] ДАБВ, ф. 67сч, воп. 2, спр. 99, арк. 6-7.
[40] НАРБ, ф. 242п, воп. 1, спр. 475, арк. 17.
[41] НАРБ, ф. 242п, воп. 1, спр. 227, арк. 17.
[42] *Sprawozdanie Poleskiego Wojewódzkiego Związku Młodzieży Wiejskiej za rok 1930*, Brześć nad Bugiem 1931, s. 21.

на тэрыторыі Свянцянскага павета прыводзіў у 1935 г. «Кур'ер віленскі». На тэрыторыі павета працавала 268 настаўнікаў. З іх 32 настаўнікі вялі святліцы, 11 настаўнікаў — вячэрнія курсы. 17 настаўнікаў узначальвалі ячэйкі Стралецкага саюза, 6 — дружыны Саюза польскага харцэрства, 6 настаўнікаў працавалі ў жаночых арганізацыях, 24 — праводзілі моладзевыя арганізацыі (хутчэй за ўсё СМВ). 192 настаўнікі самі з'яўляліся членамі Стралецкага саюза. Акрамя таго, на працягу вучэбнага года настаўнікі правялі 150 лекцый і арганізавалі 91 тэатральны паказ[43].

Але, як адзначаюць архіўныя крыніцы, узаемаадносіны моладзевых аб'яднанняў з мясцовымі ўладамі і настаўніцтвам не заўсёды складваліся добра, і падтрымка не з'яўлялася абсалютнай. Напрыклад, камендант ваеннай падрыхтоўкі Слонімскага павета паведамляў, што «ў м. Рудзе-Яворскай настаўнік Гародка сярод членаў Стралецкага Саюзу казаў, што да „Стральца" неабходна належыць толькі для выгляду, а на самой справе нічога рабіць не трэба». У тым жа Слонімскім павеце ў в. Раготна мясцовы гмінны войт супраціўляўся пакупцы радыёпрыёмніка для Стралецкага саюза[44].

Узаемаадносіны польскіх чыноўнікаў і мясцовага насельніцтва таксама складваліся не лепшым чынам. Адзін з членаў гуртка вясковай моладзі з Брэсцкага павета адзначаў у сваёй біяграфіі, якая была апублікавана ў даследаванні афіцыйнага Дзяржаўнага інстытута культуры вёскі, што «адной з галоўных балячак нашай вёскі (якая выклікае абурэнне і недавер у адносінах да ўрада) з'яўляюцца недапушчальныя паводзіны і адносіны чыноўнікаў, якія прадстаўляюць урад, да нашага селяніна. Гэтыя чыноўнікі — выканаўцы даручэнняў і загадаў урада, прапагандысты ўрадавых ідэй і думак. Гэта гмінныя, фінансавыя чыноўнікі, паліцыя і т.п. На кожным кроку адчуваецца нейкая непрыязная, фанабэрыстая атмасфера, адсутнасць сардэчнасці і даверу. За адно толькі правільнае слова супраць адразу ж будзеш названы хамам, падрыўным элементам, камуністам (апошнім абвінавачваннем празмерна злоўжываюць) (...). У гмінным ці фінансавым праўленні, у судзе ці паліцэйскім пастарунку, усюды да нашага селяніна адносяцца не як да грамадзяніна Дзяржавы, а як да варожага Дзяржаве чалавека, якога патрэбна стрыгчы, пакуль ён даецца, душыць, пакуль ён цёплы, і якому нельга давяраць ні ў якім выпадку»[45].

Той жа аўтар, які стаяў на «дзяржаўніцкіх пазіцыях», працягваў: «Недахопам, які ў інтарэсах Дзяржавы неабходна як мага хутчэй выправіць,

[43] „Kurjer Wileński", 1935, 19.11, nr 318, s. 8.
[44] ДАБВ, ф. 67сч, воп. 2, спр. 1094, арк. 19.
[45] J. Chałasiński, *Młode pokolenie chłopów*, t. 2, Warszawa 1938, s. 12-13.

з'яўляецца поўная незацікаўленасць Дзяржавы лёсам вясковай молдзі і яе жыццём. Пазбаўленая ўсялякай апекі і дапамогі, вясковая моладзь блукае крутымі шляхамі, якія вядуць да бездані боек, п'янства, злачынстваў, ці, як мухі на мёд, ідзе за падрыўной палітычнай прапагандай варожых дзяржаве палітычных дзеячаў (...). Там, дзе, дзякуючы намаганням якога-небудзь ціхага сельскага дзеяча ўзнікае якая-небудзь арганізацыя, чыноўнікі замест таго, каб прыйсці на дапамогу да гэтай беднай слабой арганізацыі, імкнуцца (ці па расхлябанасці, ці па злой волі) толькі да таго, каб абцяжарыць яе чым-небудзь, затрымаць яе развіццё. Арганізацыяй ніхто не цікавіцца, ніхто яе не падтрымлівае. На яе і яе членаў глядзяць з недаверам, збіраючы з дапамогай паліцыі даныя аб добранадзейнасці (магчыма гэта толькі ў нас на крэсах так). Зразумела, гэты недавер, адсутнасць добразычлівага супрацоўніцтва, сардэчнасці, шпіянаж і г.д. выклікаюць у моладзі расчараванне і антыпатыю, а таксама адштурхоўваюць іншых ад уступлення ў арганізацыю»[46]. Дадзенае сведчанне адносіцца да другой паловы 1930-х гадоў (яно з'явілася ўжо пасля таго, як палескі ваявода заклікаў павятовых старастаў асабіста цікавіцца развіццём моладзевага руху). Такім чынам, роля мясцовага чыноўніцтва ў развіцці моладзевых саюзаў была неадназначнай. Нават афіцыйныя крыніцы адзначалі як падтрымку, так і фармалізм, і нават варожасць.

Важнай часткай падтрымкі ўладамі санацыйнага моладзевага руху была фінансавая дапамога. Гэта добра бачна на прыкладзе СВМ «Сеў». Згодна са статутнымі дакументамі, асноўнымі крыніцамі фінансавання Саюза былі членскія і ўступныя ўзносы, прыбыткі ад правядзення мерапрыемстваў, дапамога ад грамадскіх і дзяржаўных інстытутаў і ахвяраванні прыватных асоб[47]. На самой справе ж арганізацыя фактычна знаходзілася на дзяржаўным забеспячэнні. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, справаздача аб прыбытках Палескага СВМ за 1933 г. Так, членскія ўзносы склалі 487,60 зл., прыбыткі ад выдавецкай дзейнасці — 349,35 зл. У той жа час Цэнтральным Камітэтам па справах вясковай моладзі было выдаткавана 4 389,95 зл., Праўленнем Палескага ваяводства — 1 450 зл., Палескай земляробчай палатай — 1 000 зл., мясцовым Камітэтам фонду працы — 300 зл., Праўленнем Брэсцкага павета — 960 зл. Улічваючы станоўчае сальда за мінулы год (147,23 зл.) і іншыя прыбыткі (316,20 зл.), мы бачым, што з агульнай сумы ў 9 400,33 зл. дзяржаўныя датацыі склалі 8 099,95 зл. (болей за 86%)[48].

Яшчэ большыя фінансавыя ўліванні атрымліваў Стралецкі саюз. Так, камендатура Брэсцкай акругі «Стральца» планавала прыбытковую част-

[46] Там жа.
[47] *Budowa organizacyjna Poleskiego Wojewódzkiego Związku Młodzieży Wiejskiej*, s. 9.
[48] Там жа, с. 16.

ку свайго бюджэту ў аб'ёме 354 060 зл. З іх 20 000 зл. павінна было быць накіравана ад Палескага, Люблінскага і Беластоцкага ваяводаў, 80 000 зл. — ад мясцовага самакіравання, 30 000 зл. — ад ваенных улад, 120 000 зл. — ад Галоўнага ўпраўлення «Стральца». У дадзеным выпадку дзяржаўныя датацыі склалі 310 000 зл., ці больш за 87% прыбытковай часткі бюджэту[49]. Тым не менш, у пытаннях фінансавання не ўсё складвалася добра. У першую чаргу гэта было звязана з цяжкім фінансавым станам мясцовага самакіравання. Напрыклад, Палескі ваяводскі камітэт фізічнага выхавання і ваеннай падрыхтоўкі адзначаў, што мясцовае самакіраванне, «кіруючыся добрымі намерамі», выдзяляе на развіццё дзейнасці па ваеннай падрыхтоўцы моладзі сумы, «якія не можа на працягу года знайсці»[50]. Таму асноўную фінансавую дапамогу аказвалі цэнтральныя органы ўлады.

Найбольш моцным уплыў санацыйных моладзевых арганізацый быў у асяроддзі вясковай моладзі. На тэрыторыі Заходняй Беларусі буйныя атрады Стралецкага саюза меліся таксама ў Вільні, Беластоку, Брэсце і Гродне. Так, Віленскі агульнагарадскі атрад налічваў да 700 чалавек. Самастойныя ячэйкі «Стральца» існавалі і на шматлікіх віленскіх гарадскіх прадпрыемствах (гута, дзяржаўная тытунёвая фабрыка і інш.)[51]. З 1932 г. стралецкая арганізацыя дзейнічала і ў Віленскім універсітэце[52]. Гэта была частка створанага ў 1929 г. Акадэмічнага аддзела Стралецкага саюза. Нягледзячы на шматлікасць стральцоў-студэнтаў, іх дзейнасць, за выключэннем удзелу ў арганізацыях студэнцкай узаемадапамогі, не мела дачынення да ўнутранага жыцця ўніверсітэта[53]. Часцей за ўсё віленскія студэнты-стральцы ўзначальвалі культурна-грамадскую і асветніцкую працу сярод моладзі ў гарадскіх атрада «Стральца». Менавіта яны станавіліся рэферэнтамі і кіраўнікамі грамадзянскага выхавання[54].

Колькасць членаў Стралецкага саюза стала ўзрастала. Па ўсёй Польшчы ў 1934 г. налічвалася 300 000 яго членаў, з іх у 3-й і 9-й акругах — каля 50 000 чалавек. Згодна з данымі афіцыйнай польскай прэсы таго часу, стралецкая арганізацыя Віленшчыны з'яўлялася найбольш моцнай у II РП. Ужо ў 1931 г. яна налічвала 300 атрадаў і 7 000 членаў[55]. Меньш паспяховым быў рост «Стральца» на Палессі. Па меркаванню польскіх улад, паспяховаму колькаснаму росту арганізацыі перашка-

[49] ДАБВ, ф. 1, воп. 9, спр. 516, арк. 2.
[50] ДАБВ, ф. 67сч, воп. 2, спр. 21, арк. 15.
[51] НАРБ, ф. 242п, воп. 1, спр. 465, арк. 108.
[52] „Kurjer Wileński", 1935, 25.11, nr 324, s. 3.
[53] A. Pilch, *Studencki ruch polityczny w Polsce 1932-1939*, Warszawa 1972, s. 61.
[54] „Kurjer Wileński", 1935, 9.12, nr 338, s. 3.
[55] НАРБ, ф. 242п, воп. 1, спр. 465, арк. 112.

джалі невялікі працэнт польскага насельніцтва і «гіганцкая перавага нацыянальных меншасцей». Акрамя таго, адзначалася і слабая праца мясцовых праўленняў[56]. Да гэтых прычын неабходна дадаць і складаныя ўзаемаадносіны паміж прадстаўнікамі мясцовых улад і насельніцтвам Палесся. Тым не менш да 1939 г. агульная колькасць «Стральца» дасягала 500 000 чалавек[57].

Членамі «Стральца» на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі ў першую чаргу дзеці чыноўнікаў і асаднікаў, палякаў і беларусаў-католікаў. У шэрагу маёнткаў пад націскам памешчыкаў у стралецкія фарміраванні запісваліся маладыя батракі і сезонныя работнікі. Гэта пацвярджаецца шматлікімі дакументальнымі сведчаннямі. Так, у справаздачы Гродзенскага акруговага камітэта КСМЗБ у канцы 1932 г. паведамлялася: «У „Стральцы" ў Скідалі ў асноўным сынкі чыноўнікаў ці яны самі. Але яны імкнуцца ствараць свае гнёзды на вёсках і там уцягваюць сялянскую моладзь, расказваючы пра герояў Айчыны і пра вайну»[58].

Для простай сялянскай і рабочай моладзі стралецкая арганізацыя была даволі прыцягальнай. У дакументах ЦК КСМЗБ пералічваліся асноўныя прычыны колькаснага росту Стралецкага саюза на тэрыторыі Заходняй Беларусі: моцная шавіністычная прапаганда сярод польскай і каталіцкай часткі беларускай моладзі, перабудова дзейнасці «Стральца» ў накірунку задавальнення патрэб моладзі, пашырэнне абсталявання святліц, выдзяленне новых штатных кадраў, падрыхтоўка і перападрыхтоўка ў шырокім аб'ёме кіраўнікоў з ліку самой моладзі[59].

Вялікую ролю ў прыцягненні моладзі ў Стралецкі саюз адыгрывалі льготы, якія прадстаўляліся ўдзельнікам арганізацый ваеннай падрыхтоўкі. Палескі ваяводскі камітэт па ваеннай падрыхтоўцы і фізічным выхаванню ў адной са сваіх справаздач адзначаў, што «ў значнай колькасці атрадаў жаданне працаваць у ваеннай падрыхтоўцы абапіраецца толькі на надзею на тое, што члены арганізацыі атрымаюць за працу ў будучым пэўныя льготы на вайсковай службе»[60].

Важным было і тое, што ва ўмовах эканамічнага крызісу кіраўніцтва «Стральца» магло садзейнічаць атрыманню працоўнага месца сваім членам. Так, у Брэсце пад эгідай стралецкай арганізацыі існавала «пасрэдніцтва працы», якое займалася праблемай ліквідацыі беспрацоўя сярод моладзі[61]. Стральцы заўсёды маглі разлічваць на матэрыяльную падтрымку з боку ўлад. Напрыклад, на Віленшчыне ў час голаду 1934 г.

[56] ДАБВ, ф. 67сч, воп. 2, спр. 1667, арк. 52-53.
[57] *„Стшэлец"* [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі*, т. 6, ч. 1, Мінск 2001, с. 437.
[58] НАРБ, ф. 242п, воп. 1, спр. 430, арк. 16.
[59] НАРБ, ф. 242п, воп. 1, спр. 483, арк. 13.
[60] ДАБВ, ф. 1, воп. 2, спр. 2402, арк. 53.
[61] НАРБ, ф. 242п, воп. 1, спр. 114, арк. 380.

гмінныя рады аказвалі дапамогу (збожжам, мукой, бульбай) у першую чаргу тым сельскім гаспадарам, якія з'яўляліся членамі Стралецкага саюза[62]. Прадугледжваліся і іншыя прэрагатывы для членаў ваенізаваных аб'яднанняў. Вядома, што ў мэтах прапаганды камандуючы акругай № 9 «Брэст» генерал Мечыслаў Рысь-Траяноўскі дамогся ад гаспадароў кінатэатраў «пэўных саступак, льгот і прэрагатываў членам арганізацый ваеннай падрыхтоўкі»[63].

Пагоня за рознымі льготамі, якія існавалі для членаў саюза, не магла не адбіцца адмоўна на якасці членства ў арганізацыі. Таму мае рацыю справаздача КСМЗБ з Белавежы за кастрычнік 1934 г., у якой казалася: «Стральцы гэта надзьмуты пузыр, не болей. Там панабіралі вясковых падлеткаў, якія ідуць дзеля таго, што пускаюць у кіно бясплатна. Вось іх ідэйнасць»[64]. Пра нізкую ідэйнасць стральцоў паведамляў і камендант ваеннай падрыхтоўкі з Кобрына: «Ідэйнасць членаў, за невялікім выключэннем, мізэрная. Удзел у працы прымаюць па карысных матывах. З ідэйных перакананняў працуюць адзінкі, якія ў большасці знаходзяцца на кіруючых пасадах Стралецкага саюза»[65].

Але было б памылкай ацэньваць усіх стральцоў як людзей, якія імкнуліся ў арганізацыю толькі за матэрыяльнымі ільготамі. Моладзь уцягвалася ў саюз і праз умела арганізаваную патрыятычную прапаганду, магчымасць удзельнічаць у розных спаборніцтвах, паходах, забаўляльных мерапрыемствах. Так, дзякуючы намаганням кіраўніцтва Віленскай падакругі «Стральца» ў Вільні ў 1935 г. быў створаны «Усеагульны тэатр Стралецкага саюза». Яго мэтай было правядзенне прапагандысцкай і асветніцкай працы шляхам арганізацыі адпаведных спектакляў на тэрыторыі падакругі. За рэпертуар адказвала спецыяльная літаратурна-артыстычная камісія, аматарскі калектыў тэатра складаўся з 14 чалавек. Ужо за некалькі першых тыдняў існавання тэатра яго спектаклі наведалі 1 500 чалавек[66].

Для моладзі, якая шукала прымянення сваім сілам і энэргіі, стралецкая арганізацыя прапаноўвала шмат магчымасцей для самарэалізацыі. Работнікі заходнебеларускага камсамола прызнавалі, што сярод членаў «Стральца» ёсць і «баявыя элементы, якія рвуцца да якой-небудзь працы, і фашызм выкарыстоўвае іх актыўнасць у сваіх інтарэсах»[67].

СВМ «Сеў» — СМВ таксама імкнуўся ахапіць па магчымасці найбольшую колькасць вясковай моладзі. Аднак у першую чаргу саюз аб'-

[62] *Вильнюсское подполье. Воспоминания участников революционного движения в Вильнюсском крае (1920-1939 гг.): Сб. воспоминаний*, Вильнюс 1966, с. 356.
[63] ДАБВ, ф. 1, воп. 2, спр. 2402, арк. 72.
[64] НАРБ, ф. 242п, воп. 1, спр. 475, арк. 124.
[65] ДАБВ, ф. 67сч, воп. 2, спр. 99, арк. 12.
[66] „Kurjer Wileński", 1935, 25.11, nr 324, s. 3.
[67] НАРБ, ф. 242п, воп. 1, спр. 430, арк. 98.

ядноўваў дзяцей працаўнікоў мясцовай польскай адміністрацыі, асаднікаў, палякаў і беларускіх сялян польскай арыентацыі[68]. У якасці прыкладу можна прывесці даныя аб нацыянальным складзе СВМ «Сеў» Ашмянскага павета, якія адносяцца да 1933 г. Тут з 622 членаў арганізацыі палякамі былі 563 чалавекі, беларусамі з'яўляліся 49 і літоўцамі — дзесяць[69]. Усяго ж па Віленскім ваяводстве ў 1934 г. у 248 гуртках СВМ «Сеў» было 3 610 членаў, з іх палякаў — 3 016, беларусаў — 395, літоўцаў — 140 чалавек. Афіцыйная прэса заяўляла, што «ўсе яны без якой-небудзь нацыяналістычнай нянавісці разам працуюць над узняццем сваіх вёсак з нізін цемры і галечы (...) веліч гэтай задачы прымірае і гасіць усе антаганізмы, якія імкнецца прышчапіць ім нядобрасумленная палітычная агітацыя»[70].

Але пры гэтым неабходна адзначыць, што ўлады імкнуліся да таго, каб мясцовыя арганізацыі ўзначальвалі менавіта палякі. Так, у адным з дакументаў аддзела грамадскай бяспекі Палескага ваяводства адзначалася, што «стварэнне змешаных арганізацый з'яўляецца пажаданым пры ўмове, што кіраўніцтва такіх арганізацый павінна знаходзіцца ў польскіх руках і ў праўленнях павінен мець перавагу яўны польскі элемент». Той жа дакумент даручаў павятовым старастам даведацца, «ці не з'яўляецца наплыў няпольскай моладзі ў гурткі вясковай моладзі планавай працай антыдзяржаўных элементаў з мэтай разгрому польскіх арганізацый на вёсцы»[71].

Колькасны склад СВМ «Сеў» — СМВ вызначыць даволі складана. У першую чаргу гэтаму перашкаджае тое, што многія гурткі арганізацыі існавалі толькі фармальна. Вельмі частай з'явай была цякучасць кадраў, у выніку якой дзейнасць гурткоў спынялася, а потым зноў аднаўлялася. Тым не менш, па падліках польскай гістарыяграфіі, агульная колькасць членаў СМВ на ўсёй тэрыторыі II РП у 1938 г. дасягнула 170 000 чалавек[72]. Пры гэтым лічыцца, што найбольшую актыўнасць арганізацыя праяўляла менавіта на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Асноўным накірункам дзейнасці Стралецкага саюза стала рэалізацыя дзяржаўнай праграмы ваеннай падрыхтоўкі маладога пакалення. У сваю чаргу СВМ «Сеў» — СМВ актыўна займаўся сельскагаспадарчай асветай вясковай моладзі. Але гэта не значыць, что пытанні звязаныя з дзяржаўным выхаваннем заставаліся па-за ўвагай кіраўніцтва

[68] *Кулко млодзежы вейскей*, [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі*, т. 4, Мінск 1997, с. 297.

[69] *Zew młodzieży wiejskiej. Jednodniówka ruchu młodowiejskiego pow. Oszmiańskiego*, Wilno 1933, s. 6.

[70] „Kurjer Wileński", 1934, 17.08, nr 223, s. 8.

[71] ДАБВ, ф. 1, воп. 9, спр. 483, арк. 12.

[72] B. Hillebrandt, *Polskie organizacje młodzieżowe...*, s. 165.

праўрадавых арганізацый. Найбольш яскрава гэта можна прасачыць на прыкладзе «Стральца».

Асаблівая ўвага грамадзянскаму выхаванню стала надавацца ў другой палове 1930-х гадоў. Пры гэтым падкрэслівалася сувязь грамадзянскага выхавання і ўмацавання абароназдольнасці краіны: «Статуты ўсіх існуючых моладзевых арганізацый сярод мэт і задач, акрамя іншага, маюць і выхаванне моладзі ў дзяржаўна-творчым духу. Гэтыя задачы трактуюцца разнастайна, і ў выніку ў моладзі не фармуюцца тыя рысы, якія з'яўляюцца неабходнымі для ажыццяўлення грамадзянскіх задач, асабліва такога высакароднага абавязку, як служба ў войску»[73].

У снежні 1936 г. у Брэсце адбылася нарада, прысвечаная актывізацыі грамадзянскага выхавання ў Стралецкім саюзе. На ёй было заяўлена, што ідэя службы з'яўляецца зместам і сутнасцю грамадзянскага выхавання. Гэтая ідэя павінна была прышчэплівацца ў час розных адукацыйных ці выхаваўчых мерапрыемстваў, паколькі «без яе засваення выхаваўча-грамадзянская праца не выканае сваіх задач»[74].

Вынікам дадзенай нарады стала «Праграма грамадзянскага выхавання для ўзроставых адукацыйных груп у аддзелах і пададдзелах Стралецкага саюза», якая была выдадзена ў Брэсце ў 1937 г. Ва ўступе да «Праграмы» падкрэслівалася, што грамадзянскае выхаванне з'яўляецца асноўнай справай працы Стралецкага саюза. Але адначасова адзначалася, што шматлікія інструктары грамадзянскага выхавання, каменданты і члены праўленняў недастаткова добра арыентуюцца ў сферы патрабаванняў, якія ставіліся папярэднімі праграмамі грамадзянскага выхавання. Акрамя таго, гэтыя папярэднія праграмы былі «празмерна агульнымі, і зводзіліся, перш за ўсё, да гутарак і лекцый па гісторыі Польшчы, сучаснай Польшчы». Галоўнай мэтай выдання новай праграмы абвяшчаўся «клопат пра больш шырокае і дакладнае вызначэнне сферы працы, больш выразным удакладненні патрабаванняў, правядзенні яе натуральным чынам, а таксама наданні гэтай працы рысаў непарыўнасці, сістэматычнасці і празрыстасці, і перш за ўсё мэтазгоднасці»[75].

Праграма складалася з наступных накірункаў: арганізацыйнае выхаванне, дзяржаўнае выхаванне, прафесійная падрыхтоўка, чытанне, экскурсіі, культурна-мастацкае выхаванне.

У час рэалізацыі першай часткі праграмы стральцы вывучалі статут, гісторыю, традыцыі і звычаі арганізацыі — Стралецкага саюза. Часткай гэтага выхавання павінна была стаць і непасрэдная дзейнасць згодна

[73] ДАБВ, ф. 67сч, воп. 2, спр. 1669, арк. 3.
[74] ДАБВ, ф. 67сч, воп. 2, спр. 193, арк. 28.
[75] *Program dla grup wiekowo-wyszkoleniowych...*, s. 5.

з правіламі аб'яднання. Доказам арганізацыйнай сталасці быў актыўны ўдзел у грамадска-дзяржаўных справах свайго атачэння. Арганізацыйнае выхаванне павінна было даць аснову для далейшых частак грамадзянскага выхавання[76].

Дзяржаўнае выхаванне ахоплівала пытанні гісторыі польскай дзяржавы, сучаснай Польшчы, тэрытарыльнага самакіравання і вывучэння ўласнага атачэння з пункту гледжання патрэб ці магчымасці перабудовы. Асаблівая ўвага надавалася прыкладам з гісторыі, «у якіх доблесць польскай арміі пакрыла славай польскі народ сярод іншых народаў (Грунвальд, асада Вены, напалеонаўскія войны, легіёны Пілсудскага, бітва пад Варшавай)»[77]. Праграма дзяржаўнага выхавання шмат у чым пераклікалася са школьнай праграмай. Гэта можна растлумачыць тым, што вясковая моладзь, якая складала аснову «Стральца», з падлеткавага ўзросту ў асноўнай сваёй масе заставалася па-за выхаваўчым уплывам усеагульнай школы. Таму польскія ўлады і імкнуліся гэта кампенсаваць. Дзяржаўнае выхаванне павінна было падрыхтаваць членаў Стралецкага саюза да «належнага разумення сучаснага грамадска-палітычнага жыцця, якое з'яўляецца вынікам гістарычнага дасягнення папярэдніх пакаленняў і намаганняў найлепшых сыноў Айчыны; павінна было падрыхтаваць і прывучыць да дзейснага ўдзелу ў агульнай працы свайго асяроддзя, выпрацаваць дух боегатоўнасці ў адносінах да ўнутраных і знешніх ворагаў у адпаведнасці з указаннямі Стваральніка Стралецкага саюза — Будаўніка сучаснай Польшчы, Першага Маршала Юзэфа Пілсудскага»[78].

Вядучай ідэяй стралецкага дзяржаўнага выхавання быў дух польскага ўра-патрыятызму. Гэта стала часткай паланізацыі беларускай моладзі. Асабліва яскрава гэта прасочваецца на прыкладзе «стралецкай» інтэрпрэтацыі гісторыі. Так, бітва пры Грунвальдзе трактавалася як перамога выключна польскай зброі, а польска-савецкая вайна, у выніку якой Польшчай была акупавана Заходняя Беларусь, мела важнае «гістарычнае і выхаваўчае значэнне» і была «апошнім этапам умацавання межаў незалежнай Польшчы»[79].

Галоўнай мэтай прафесійнай падрыхтоўкі быў пошук месца працы для сваіх членаў праз выкарыстанне ўсялякіх магчымасцей для стварэння новых працоўных месцаў. Вынікам павінна было стаць «узбагачэнне культурных і гаспадарчых дасягненняў вёскі і горада»[80].

[76] Там жа.
[77] Там жа, с. 16.
[78] Там жа, с. 6.
[79] Там жа, с. 23.
[80] Там жа, с. 6.

Наступны накірунак грамадзянскага выхавання — чытанне — прадугледжваў выхаванне любові да ўмелага чытання кніг і прэсы з «пранікненнем у сэнс і вядучыя думкі». Усе члены «Стральца» павінны былі быць сталымі чытачамі мясцовых бібліятэк, пры кожным атрадзе «Стральца» стваралася свая бібліятэка. Трэба адзначыць, што большая частка рэкамендаванай стральцам да чытання літаратуры была прысвечана гісторыі польскага нацыянальнага руху, дзейнасці Баявой арганізацыі ППС, ПАВ, Легіёнаў (г.зн. арганізацый, створаных Ю. Пілсудскім). Але разам з прапагандысцкімі агіткамі рэкамендаваліся і творы класікаў польскай літаратуры[81].

Згодна з «Праграмай» пры правядзенні экскурсій рэкамендавалася наведваць суседнія атрады «Стральца» і блізкіх да яго арганізацый (такіх экскурсій павінна было быць шмат), узорныя сельскія гаспадаркі і прамысловыя майстэрні, дальнія гістарычныя і прыродныя помнікі, прамысловыя цэнтры. Лічылася, што экскурсіі маюць «шматлікія выхаваўчыя моманты»[82].

Культурна-мастацкае выхаванне прадугледжвала стварэнне самадзейных харавых і тэатральных гурткоў, спартыўных секцый, удзел у абсталяванні святліц (клубаў).

За ажыццяўленне «Праграмы» адказвалі спецыяльныя інструктары грамадзянскага выхавання. Таксама існавалі інструктары ў асобных накірунках працы. Але дакумент спецыяльна падкрэсліваў, што моладзь павінна самастойна авалодаць па магчымасці большым аб'ёмам прадугледжанага матэрыялу. Інструктары грамадзянскага выхавання павінны былі толькі ў самыя цяжкія моманты прыходзіць на дапамогу і даваць парады[83].

У якасці дадатку да «Праграмы» прыкладаўся спіс урачыстасцей, святкаванне якіх таксама павінна было служыць мэтам грамадзянскага выхавання членаў Стралецкага саюза. Сярод гэтых святаў былі Дзень Незалежнасці, гадавіны паўстанняў 1794 г., 1830-1831 гг. і 1863-1864 гг. Абавязковым быў удзел у арганізацыі імянін прэзідэнта II РП Ігнацы Масціцкага, маршалаў Юзэфа Пілсудскага і Эдварда Рыдз-Сміглага. У жніўні адзначалася свята Стралецкага саюза[84].

Цэнтрамі грамадзянскага выхавання з'яўляліся святліцы (клубы). Лічылася, што яны даюць магчымасць «уздзейнічаць адначасова на розум, пачуцці і волю асобы, развіваць пэўныя яе асаблівасці і адначасова рыхтаваць яе да грамадскага жыцця і актыўнага ў ім удзелу»[85].

[81] Там жа, с. 42-45.
[82] Там жа, с. 7.
[83] Там жа, с. 9.
[84] Там жа, с. 37.
[85] *Praca świetlicowa. Instrukcja dla świetlic ZPOK*, Warszawa 1934, s. 6.

У выніку такога падыходу Стралецкі саюз і іншыя праўрадавыя моладзевыя арганізацыі імкнуліся стварыць шырокую сетку сваіх святліц. Так, у 1935 г. на тэрыторыі Вільні дзейнічалі 14 святліц «Стральца». Таксама ў Вільні існавала адна святліца праўрадавай Арганізацыі працуючай моладзі[86]. Зразумела, што ў правінцыі сітуацыя складвалася інакш. Але і там праўрадавыя саюзы стваралі свае клубы. Калі для гэтага не было магчымасцей, ствараліся агульныя святліцы ці святліцы пры школах. У якасці прыкладу можна прывесці становішча ў Палескім СМВ. У цяжкіх эканамічных умовах палескай вёскі Саюз здолеў стварыць толькі 45 сваіх асабістых святліц. Яшчэ 18 клубаў былі сумеснымі. Абсалютная ж большасць іх — 154 — дзейнічалі пры школах[87].

Такім чынам, праўрадавыя саюзы з'яўляліся неад'емным элементам сістэмы рэалізацыі санацыйнай канцэпцыі дзяржаўнага выхавання. У дадзеным кантэксце іх галоўнай задачай было ахапіць сваім выхаваўчым уздзеяннем пазашкольную моладзь і падлеткаў. Як сведчаць архіўныя матэрыялы і даныя гістарыяграфіі, найбольшых поспехаў у гэтым накірунку дасягнулі такія арганізацыі, як Стралецкі саюз і СВМ «Сеў» — СМВ, якія дзейнічалі ў асноўным сярод вясковага маладога пакалення. У асяроддзі гарадской моладзі аналагічныя задачы павінна была выконваць АПМ, якая, аднак, не дасягнула такога развіцця як два вышэйназваныя аб'яднанні.

**Streszczenie**

Władze sanacyjne dążyły do rozszerzenia swoich wpływów na młode pokolenie II Rzeczypospolitej, w tym również na młodzież zachodniobiałoruską. Temu celowi służyła realizacja rządowej koncepcji wychowania państwowego. W jej wdrożeniu wśród młodzieży pozaszkolnej aktywny udział brały prorządowe organizacje młodzieżowe, przede wszystkim Związek Strzelecki „Strzelec" i Związek Młodzieży Wiejskiej „Siew" — Związek Młodej Wsi. Udało się osiągnąć znaczne rezultaty poprzez skupienie w szeregach tych organizacji w pierwszej kolejności młodzieży polskiej oraz młodych Białorusinów katolików. Dzięki solidnemu wsparciu kół rządowych i administracji samorządowej organizacje rozwinęły aktywną działalność w dziele obywatelskiego wychowania miejscowej młodzieży. Należy podkreślić, że w warunkach Zachodniej Białorusi taka działalność miała charakter wyraźnie polonizatorski.

**Summary**

Sanacja authorities aspired to extend their influence over the young generation of the II Republic of Poland, including West Belarusian youth too. Such aim was reflected in the pursuit of the government concept of civic education. Pro-government youth organizations, most of all, Riflemen's Association „Rifleman" and Rural Youth Association „Seeds" — Young Village

[86] *Z oświaty pozaszkolnej w okręgu szkolnym Wileńskim. Sprawozdanie za rok 1934/35 i wytyczne programowe na rok 1935/36*, Wilno 1935, s. 259.

[87] *Dziesięciolecie Związku Młodej Wsi województwa Poleskiego. 1928-1938*, Brześć nad Bugiem 1938, s. 120-121.

Association, took an active part in implementation of this policy among rural youth. Their activity was quite successful, most of all, thanks to assembling Polish youth and young Belarusian Catholics within the structures of these organizations. Thanks to solid support provided by government circles and self-government administration, these organizations developed efficient activity in the area of local youth education. It should be emphasized that under the conditions of West Belarus, such activity was clearly polonizing in its nature.

**Wital Krywuć** — doktor nauk historycznych, docent Katedry Dyscyplin Socjalno-Humanistycznych Baranowickiego Uniwersytetu Państwowego. Zainteresowania badawcze: ruch młodzieżowy w Zachodniej Białorusi; polityka młodzieżowa władz polskich w Zachodniej Białorusi w okresie międzywojennym.